# Чытка — усяму «Галава»

**Надзея Бунцэвіч**

*Фотаздымкі Уладзіслава Рахубы*

Чыткі новых п’ес даўно прапісаліся ў РТБД і Цэнтры беларускай драматургіі, створаным на яго базе. Праўда, раней такія праекты былі больш камернымі, сціплымі па мастацкіх рашэннях, бо ладзіліся пераважна ў невялічкім пакойчыку. Цяпер жа перанесліся на сцэну РТБД і збіраюць паўнюткія залы. Здзіўляцца тут няма чаму, бо чыткі сталі папраўдзе тэатралізаванымі і адрозніваюцца ад паўнавартасных спектакляў хіба тым, што артысты падглядаюць у раздрукоўкі сваіх тэкстаў, а не вымаўляюць іх на памяць.

«Галава» Канстанціна Сцешыка чакалася з асаблівай цікавасцю. Па-першае, гэта адна з зусім новых п’ес (якая, дарэчы, перамагла на конкурсе сучасных беларускіх п’ес «Другая дзея», арганізаваным ЦБД) і яе прэм’ера ў Беларусі. Па-другое, назва перагукаецца з «Галавой» Ігара Сідарука, што была напісаная ў 1990-м, праз два гады пастаўленая ў РТБД, а пазалетась зноў прэзентаваная маладой рэжысёрам Яўгеніяй Давідзенка. Маўляў, новае-чарговае дакрананне беларускай драматургіі да тэатра абсурду? Па-трэцяе, цяперашняя чытка працягвала яшчэ больш шырокае знаёмства публікі з творчасцю Сцешыка — парадаксальнай, поўнай нечаканых ходаў, стылёва-жанравых мікстаў, асацыятыўных шэрагаў і ахопу шматлікіх пластоў сусветнай культуры. П’есы гэтага беларускага драматурга ўжо больш за 15 гадоў вядомыя ў Расіі: перамагаюць на конкурсах, ставяцца ў тэатрах, маюць багатае фестывальнае жыццё — у тым ліку ў выглядзе чытак. У нас знаёмства з імі пачалося з «Кароткачасовай», пастаўленай дзесяцігоддзе таму расійскім рэжысёрам Сямёнам Александроўскім, прычым... без удзелу артыстаў. Праз пяць гадоў у Гомельскім гарадскім маладзёжным тэатры, схільным да сучасных тэндэнцый, з’явіўся спектакль «Ляцелі арэлі»



ў пастаноўцы нашага Дзяніса Паршына, атрымаўшы прызнанне публікі, крытыкаў і далейшы фестывальны лёс. Следам узніклі сталічныя «Запалкі», увасобленыя Таццянай Ларынай. Летась у РТБД — «Камень дурасці», графічна строгі па візуальным рашэнні і бязмежны па разгортванні тэм і думак. У студзені на гэтай жа сцэне адбылася цудоўная, па-мастацку дасканалая чытка «Сябра мой», што раскрыла дадатковыя сэнсавыя адгалінаванні п'есы, яе нязмушаны гумар і трагічную сутнасць вечнай тэмы — бязмежнай адзіноты пасярод людскога натоўпу. У лютым — «Галава». Тры апошнія падзеі ў адным тэатры — чым не своеасаблівы сцешыкаўскі фестываль? Назва так і просіцца: «Сцежкамі Сцешыка».

Але вернемся да «Галавы». Па-чацвёртае, яшчэ адной прычынай павышанай цікавасці да яе чыткі ў РТБД стала новае рэжысёрскае імя. Колішняя выпускніца БДУКіМа Алена Зміцер паспела папрацаваць актрысай Беларускага дзяржаўнага маладзёжнага тэатра, потым — Камернага драматычнага тэатра «Левендаль» у Санкт-Пецярбургу, здымалася ў кіно. Цяперашняя чытка можа лічыцца яе рэжысёрскім дэбютам — надзвычай удалым.

Па-пятае, прыцягвала жанравае азначэнне — хорар-гісторыя пра нечаканую знаходку пад лаўкай. Па-шостае —











ярка выяўленая неабходнасць знайсці да пастаноўкі нейкі хітры ключык, бо п'еса (нават па апісанні ў анонсе) ну ніяк не паддаецца традыцыйна рэалістычнаму сцэнічнаму рашэнню. Хлопец прыносіць свайму падпітаму сябру выпадкова знойдзеную галаву — жывую. Тая пачынае падміргваць то левым, то правым вокам, што азначае «так» ці «не».
Без тэатра лялек не абысціся? Але могуць быць і іншыя варыянты. Спектакль Ніжняга Ноўгарада, пастаўлены Русланам Кутлыевым, адкрываў увосень Міжнародны тэатральны Onlife IDEAFest. Назва фестывалю, апроч уласна «ідэі», уяўляе сабой абрэвіятуру: International Drama Experimental Art. А onlife азначае сумесь акцёрскай ігры з лічбавым атачэннем у рэальным часе. Спектакль паказваўся анлайн, і артысты, разглядаючы адсутную на экране галаву, зазіралі ў відэакамеру — быццам унутр нас саміх. Адчуванне, што зазіраюць табе ў душу, склалася не толькі ў мяне: пра гэта гаварылі практычна ўсе ўдзельнікі анлайн-абмеркавання, якое ладзілася пасля прагляду.
Алена Зміцер знайшла іншы падыход. Спачатку мы ўбачылі чорную постаць таго, хто страціў галаву (Аляксандр Ніканенка, які прайшоў праз усю сцэну і застаўся ляжаць











**АБСУРДНАСЦЬ СІТУАЦЫІ ЯК МАГА ЛЕПЕЙ ВЫМУШАЕ «ЎКЛЮЧЫЦЬ ГАЛАВУ», КАБ ВЫРАШЫЦЬ ФІЛАСОФСКІЯ РАЗВАГІ СЯБРОЎ, ШТО ЗАСТАЛІСЯ БЕЗ АДКАЗУ: ХТО МЫ І ЦІ ЁСЦЬ МЫ НАСАМРЭЧ.**

на ёй да фіналу спектакля). Потым — ірэальную выяву самой галавы, падобную да часткі сучаснай інсталяцыі. На экране часам узнікалі фрагменты пластылінавых мультфільмаў Гары Бардзіна, пра што яшчэ да пачатку прагляду папярэджваў надпіс «Саюзмультфільм». Але ў цэнтры апынуўся дуэт Максіма Брагінца, роля якога пазначана ў п'есе як Я, і Дзмітрыя Давідовіча (Палкін, што прыцягнуў таямнічую знаходку). У іх дыялогу скарыстоўвалася і апрацоўка гуку, і адначасовыя рухі шыяй, перадплеччам накшталт гэтакага ціку. З асаблівай цікавасцю чакаўся фінал, дзе павінен з'явіцца добра падпіты Пухаў (Дзяніс Аўхарэнка) і знішчыць галаву. Усё так і адбылося — і менавіта ў гэты момант знікла чорная фігура: страціўшы галаву цяпер ужо назаўжды, яна канчаткова спыніла сваё існаванне. Засталіся хіба думкі — гледачоў. Бо абсурднасць сітуацыі як мага лепей вымушае «ўключыць галаву», каб вырашыць філасофскія развагі сяброў, што засталіся без адказу: хто мы і ці ёсць мы насамрэч.